© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819–3625 №16-17(1-2), 2011

POLITICAL SPHERE

Language Politics №16-17(1-2)/2011

Abstracts and Key Words

Language Politics: the Present

Iryna Lašuk and Aksana Šeliest (Iryna Lashuk Aksana Shelest). **The Symbolic and Communicative Dimensions of the Linguistic Practices of the Belarusian Poles.**

The article considers the role of the Polish language as one of the basics for constructing ethnic identity of the Belarusian Poles, the factors of choosing the native language as a specific symbolic act and the influence of this choice on other aspects of the contents of the group identity. A special attention is paid to the analysis of the use of Polish, Belarusian and Russian in the real communicative practices of the Belarusian Poles, orientations for preservation and translation of the Polish language as one of the mechanisms for saving identity and cultural peculiarity of the given community.

Keywords: Belarusian Poles, Ethnic Identity, Language, Language Practices, Diglossia

Aliaksiej Lastoŭski (Aliaksei Lastouski). **The Images of Authority, People and «Others» in Public Speeches of Belarusian Top Officials During the Period of Liberalization (2008–2010)**

The article examines the processes in the formation and translation of the images of authority, people and «others» in public speeches of Belarusian officials during the period of liberalization (2008-2010). The hypothesis is checked, according to which liberalization should be expressed in public texts, where it must lead to the abandonment of an isolation strategy and to reduction of aggression towards «others». The author concludes that Belarusian authorities understood the liberalization in a limited format, which finally led to a natural collapse of this course.

Keywords: Political Identity, Public Speeches, Belarusian Officials, Liberalization

Uladzislaŭ Ivanoŭ (Uladzislau Ivanou). **Feminization Nomina Agentis of the Belarusian Language and the Problem of Colonization**

The article deals with a narrow and rather marginal linguistic topic – the feminization Nomina agentis of the Belarusian language. At firts sight, the topic seems too narrow, but its

understanding and artciulation in the light of the present debates around the Belarusian language, as well as in the light of feminism, leads to the colonialist perspective. The examples of acception and rejection of feminization show clearly that the official language is a colonial product, which refers to the stylistic norms of the Russian language.

Keywords: Colonialism, Linguistic Colonialism, Decolonization, Feminization of Language, Feminization Nomina Agentis, Language Policy

Language Politics: History

Andrej Kazakievič, Andrej Asadčy (Andrei Kazakevich, Andrei Asadchy). **To begin writing in Belarusian. Regional and social composition of Belarusian Revival, the end of the 19th – beginning of the 20th century**

The article offers the results of the biographical analysis of Belarusian cultural movement representatives, who started their literary or social and political writing in Belarusian language between years 1880 and 1918. Particularly, the geography of birth, the age of joining the cultural movement, social origin, cause of death and some other parameters are examined. The analysis shows some important regional and social features of the Belarusian movement representatives as a group, and gives a more detailed picture of the nation-building process at the turn of the 19th to 20th century.

Keywords: Belarusian Nation, Renaissance, Cultural Movement, Nation-building, Social History

Alieh Dziarnovič (Aleh Dziarnovich). **Lithuanian Language in the Grand Duchy of Lithuania: between Function and Status**

The main problem, which is placed in the article: why the Lithuanian language has not received the official status in the State, which was called the of the Grand Duchy of Lithuania (GDL)? And this happened at a time when the beginning of the 16th C. have survived the first written examples of fixation of the Lithuanian language, and from 1547 there existed a rich tradition of the Lithuanian printing (predominantly in the Duke of Prussia). The author sees a possible answer to the recognition that in a multiethnic and multicultural society of the GDL in 15th–17th C. there was a language situation «a lot of diglossias». In this situation, for each language have been clearly set out certain public functions. In contrast to bilingualism in the socio-linguistic phenomenon of diglossia one who says, evaluates its idiom on a scale of «solemn – everyday». At the same time the public sphere is not used two language systems (formal and folk).

Keywords: Social and Linguistic Situation, Catechesis, Book-printing, Official Language, Diglossia, the Grand Duchy of Lithuania

Political Ideas

Iryna Michiejeva (Iryna Mikheyeva). **The Political, Social, and Cultural Basis of «The Fourth Commonwealth of Poland» Ideologeme.**

The article uncovers the specificity of a complex of cultural, historical, political, economic and mental causes and conditions of the formation of «The Fourth Commonwealth of Poland» ideologeme in its right version (in the ideological framework of «Law and Justice»). A number of archetypal foundations of a polish phenomenon of «historical policy» (the enemy myth, the new state and human myth, the sacrifice myth) are analyzed, as well as the appearance of «pagan past» in the political present of the Polish state (the sacred mountain cult, martyrological cult). The author concludes that it is reasonable to examine cultural and political history of Poland in terms of post-colonialism, which makes it possible to find a peculiar ideology of PNR heritage elimination, rebel mythology and the cult of defeat in the national conservative political discourse.

Keywords: European Integration, Political Mythology, Conservatism, Nationalism, Historical Policy, Archetype

Political Institutions

Vadzim Smok. **The Shaping of Regional Authorities in Belarus and Poland: a Comparative Analysis of Hrodna Voblasc and Podlasie Voivodship.**

The article examines how the political and economic institutions of Belarus and Poland affect the process of elite shaping in Hrodna voblasc and Podlasie voivodship. The hypothesis states that different institutional heritage, current political regime and economic structure will result in different structures of regional elite. A comparative analysis of regional representative bodies is conducted on the basis of deputies' data by a number of criteria. The results partly corroborate the given thesis, as obvious distinctions in composition of the two bodies are seen. However, a certain similarity of two cases is traced, as well as some other factors that impact on the shaping of regional elites. These points make us assume the complexity and ambiguity of the studied process.

Keywords: Hrodna Voblasc, Podlasie Voivodship, Regional Elites, Democracy, Authoritarianism

Reviews: history

Aliaksandr Šamiakin (Aliaksandr Shamiakin). **From Brest to BSSR.** *Траццяк, С. А. (2009). Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі: лістапад 1917 – студзень 1919 г.*

The review examines the book of the Belarusian historian S. Tracciak, which covers political and state-building processes in Belarus in years 1917–1919.

Keywords: Review, Belarusian Popular Republic, Belarusian Soviet Socialist Republic, Belarusian State, Revolution, World War I

Aliaksandr Filipaй (Aliaksandr Filipau). **Belarus: Unconventional History.** *Беларусь в XX веке: нетрадиционное представление истории (2010). Под ред. В. Н. Сидорцова.*

The review deals with the debated interpretation of Belarusian history in the book edited by Belarusian historian Sidarcoŭ. Some concepts, methods and empirical materials presented in the book are critically analyzed

Keywords: Review, History of Belarus, History, Synergy, Everyday History

Uladzislaй Ivanoй (Uladzislau Ivanou). **«Together but almost apart».** *Монолатій, Іван (2010). Разом, але майже окремо. Взаємодія етнополітичних акторів на західноукраїнських землях у 1867–1914 рр.*

A book of Ukrainian researcher Ivan Monolatyj, which focuses on ethnic and political development of Western Ukraine in the second half of the 19th – beginning of the 20th century, is reviewed.

Keywords: Review, Western Ukraine, Ethnic Politics, Ethnic Relations, Austria-Hungary

Uladzimir Ščerbaй (Uladzimir Shcherbau). **Eastern Europe – United by Big Blood.** *Snyder, Timothy (2010). Bloodlands. Europe between Hitler and Stalin.*

This is the review of a quite famous book by American historian T. Snyder. The concept and method of historical narrative are analyzed. Also, the reviewer points at certain problems of the study caused by the use of mostly secondary historical sources.

Keywords: Review, World War II, Political Repressions, Mass Killings, Victims of War

Reviews: Society and Politics

Aliaksiej Lastoŭski (Aliaksei Lastouski). **The Rebel of «Tutejšyja» against the Nation.** *Чернявская, Юлия (2010). Белорусы. От тутэйшых – к нации.*

The review examines the book of Belarusian researcher Julija Charniauskaja, which deals with the peculiarities of the Belarusian nation and national identity formation.

Keywords: Review, Belarusian Nation, Identity, Ethnic History, Folklore, National Consciousness

Paviel Barkoŭski (Pavel Barkouski). **Dialogues for the Reappraisal of Values.** *Мацкевич, В.В. (2010). Переоценка ценностей в культуре и истории Беларуси.*

The review examines a book of a famous Belarusian intellectual and public figure Uladzimir Mackievič. The author's logic in the solution of «value problem» in modern Belarusian society and culture is analyzed.

Keywords: Review, Uladzinir Mackievič (Vladimir Matskevich), Cultural Values, Belarusian Politics, Interpretation of History, Methodology

Andrej Asadčy (Andrei Asadchy). **Within the Ideological Process: Ungovernable Flow of Facts and Ideas.** *Слука, О. Г. (2010). Идеологические процессы в Беларуси.*

The review critically examines the book of Aleh Sluka, an active propagator of «ideology of Belarusian state», which covers the ideological processes in Belarus.

Keywords: Review, Ideology of Belarusian State, National Idea, Belarusian Politics, Belarusian State

Tacciana Čyžova (Tatsiana Chyzhova). **Belarusian Yearbook: Analytics, Science and Political Journalism.** *Белорусский ежегодник. Сборник обзорных и аналитических материалов по развитию ситуации в Республике Беларусь (2010). Сост. и ред. А. Паньковский, В. Костюгова.*

The essay reviews a well-known annual publication on social, political and economic development of Belarus in 2010.

Keywords: Review, Belarusian Politics, Economy, Society, Analytics, Political Science

Andrej Kazakievič (Andrei Kazakevich). **Belarusian Dictionary of Plagiarism: copy + past.** *Шынкароў, В. В., Раманава, С. П. (2011). Беларускі палітычны слоўнік. Мінск: Адукацыя і выхаванне.*

The review analyzes a special dictionary of political terms, prepared by the workers of Belarusian state higher education institutions.

Keywords*:* Political Science, Politics, Dictionary, Terminology, Plagiarism

Siarhiej Bohdan (Siarhei Bohdan). **An Original Study of an Unoriginal Problem.** *Manufacturing Enemy Images? Russian Media Portrayal of Latvia (2008). Ed. Nils Muižnieks.*

The review examines a book by modern Latvian researchers. It focuses on the causes, context and strategies of the enemy image formation in Russian mass media.

Keywords: Review, Latvia, Russia, Enemy Image, Informational Wars, Mass Media

Siarhiej Bohdan (Siarhei Bohdan). **The Ultimate Afghanistan of the Belarusian Science.** *Стурейко, Степан, Медяник, Владимир (2009). Афганистан: этнополитический конфликт и проблема перемещенных лиц.*

The review critically analyzes the book by Belarusian historians, which deals with the problem of armed conflict in Afghanistan.

Keywords: Review, Afghanistan, Armed Conflict, Refuge, Belarusian Science, Oriental Studies

© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819–3625 №16-17(1-2), 2011

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Палітыка мовы №16-17(1-2)/2011

Анатацыі і ключавыя словы

Палітыка мовы: сучаснасць

Ірына Лашук, Аксана Шэлест. Сімвалічнае і камунікатыўнае вымярэнне моўных практыкаў беларускіх палякаў

У артыкуле разглядаецца роля польскай мовы як адной з падстаў канструявання этнічнай ідэнтычнасці беларускіх палякаў, фактары выбару роднай мовы як спецыфічнага сімвалічнага акту і ўплыў гэтага выбару на іншыя аспекты зместу групавой ідэнтычнасці. Асаблівая ўвага нададзена аналізу выкарыстання польскай, беларускай і рускай моваў у рэальных камунікатыўных практыках беларускіх палякаў, установак на захаванне і трансляцыю польскай мовы як аднаго з механізмаў захавання ідэнтычнасці і культурнай своеасаблівасці дадзенай супольнасці.

Ключавыя словы: беларускія палякі, этнічная ідэнтычнасць, мова, моўныя практыкі, дыгласія

Аляксей Ластоўскі. Вобразы ўлады, народу і «чужых» у публічных выступах вышэйшых дзяржаўных асобаў Беларусі перыяду «лібералізацыі» (2008–2010 гады)

У дадзеным артыкуле аналізуюцца працэсы фарміравання і трансляцыі вобразаў улады, народа і «чужых» у выступах беларускіх дзяржаўных асобаў перыяду лібералізацыі (2008–2010 гг.). Правяраецца гіпотэза, паводле якой лібералізацыя павінна выяўляцца і ў публічных тэкстах, дзе яна мусіць весці да адмовы ад стратэгіі ізаляцыі і зніжэння агрэсіўнасці ў адносінах да тых, хто традыцыйна ўспрымаецца «чужымі». Робіцца выснова, што лібералізацыя беларускімі ўладамі разумелася ў вельмі абмежаваным фармаце, што ўрэшце прывяло да заканамернага згортвання гэтага курсу.

Ключавыя словы: палітычная ідэнтычнасць, публічныя прамовы, беларускія афіцыйныя асобы, лібералізацыя

Уладзіслаў Іваноў. Фемінізацыя nomina agentis беларускай мовы і праблема каланізацыі

Артыкул прысвечаны вузкай і досыць маргінальнай моўнай тэме – фемінізацыі nomina agentis беларускай мовы. Калі на першы погляд тэма ўспрымаецца занадта

вузкай, то яе разуменне і артыкуляванне праз прызму сучасных дэбатаў вакол беларускага правапісу, а таксама праз прызму феміністкую вядзе да каланіялісцкай перспектывы. На прыкладзе прыняцця і адмовы фемінізацыі выразна бачыцца, наколькі афіцыйная мова – каланіяльны прадукт, які спасылаецца на стылістычныя нормы рускай мовы.

Ключавыя словы: каланіялізм, моўны каланіялізм, дэкаланізацыя, фемінізацыя мовы, фемінізацыя nomina agentis, моўная палітыка

Палітыка мовы: гісторыя

Андрэй Казакевіч, Андрэй Асадчы. **Пачаць пісаць па-беларуску. Рэгіянальны і сацыяльны склад беларускага адраджэння, канец XIX – пачатак XX стагоддзя)**

Артыкул прапануе вынікі аналізу біяграфій прадстаўнікоў беларускага культурнага руху, якія пачалі публіцыстычную ці літаратурную дзейнасць на беларускай мове ў перыяд паміж 1880 і 1918 гадамі. У прыватнасці разглядаецца геаграфія нараджэння, узрост далучэння да культурнага руху, сацыяльнае паходжанне, адукацыйны ўзровень, прафесійны склад, працягласць жыцця, прычыны смерці і некаторыя іншыя параметры. Праведзены аналіз дазваляе выявіць некаторыя істотныя рэгіянальныя і сацыяльныя асаблівасці прадстаўнікоў беларускага руху як групы і больш дэталёва разумець нацыятворчы працэс на мяжы XIX і XX стагоддзяў.

Ключавыя словы: беларуская нацыя, адраджэнне, культурны рух, нацыятварэнне, сацыяльная гісторыя

Алег Дзярновіч. **Літоўская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім: паміж функцыяй і статусам**

Галоўная праблема, якая ставіцца ў артыкуле, – чаму літоўская мова, маючы з пачатку XVI ст. свае першыя пісьмовыя фіксацыі, а ад 1547 г. і багатую традыцыю кнігадрукавання (праўда, пераважна ў герцагскай Прусіі), так і не здолела здабыць статус афіцыйнай канцылярскай мовы ў дзяржаве, якая мела назву Вялікае Княства Літоўскае? Аўтар артыкула бачыць магчымы адказ у прызнанні таго, што ў шматэтнічным і шматкультурным грамадстве ВКЛ XV–XVII в. існавала моўная сітуацыя «мноства дыглосій», калі за кожнай мовай былі даволі выразна замацаваныя пэўныя грамадскія функцыі. У адрозненне ад білінгвізму дыглосія, як сацыя-лінгвістычны феномен, прадугледжвае тым, хто гаворыць, ацэнку сваіх ідыём паводле шкалы «урачыстае – будзённае». У адной і той жа грамадскай сферы адначасова не выкарыстоўваліся дзве моўныя сістэмы (афіцыйная і народная).

Ключавыя словы: сацыялінгвістычная сітуацыя, катэхізацыя, кнігадрукаванне, афіцыйная канцылярская мова, дыглосія

Палітычныя ідэі

***Ірына Міхеева.* Палітычныя і сацыякультурныя асновы ідэалагемы «Чацвёртая Рэч Паспалітая»**

Артыкул раскрывае спецыфіку складанага комплексу культурна-гістарычных, палітыка-эканамічных і ментальных прычын і ўмоў станаўлення ідэалагемы «Чацвёртая Рэч Паспалітая» ў яе правай версіі (у рамках сацыял-кансерватыўнай ідэалогіі партыі «Права і Справядлівасць»). Аналізуецца шэраг архетыпічных асноў польскага феномену «гістарычнай палітыкі» (міф ворага, міф новай дзяржавы і новага чалавека, міф ахвяры), а таксама праявы «паганскага мінулага» ў палітычным сучасным польскай дзяржавы (культ святых гор, мартыралагічны культ). Робіцца выснова аб мэтазгоднасці разгляду культурна-палітычнай гісторыі Польшчы ў катэгорыях посткаланіялізму, які дазваляе выявіць у нацыянальна-кансерватыўным палітычным дыскурсе спецыфічныя ідэалогію анігіляцыі спадчыны ПНР, паўстанцкую міфалогію і культ паразы.

Ключавыя словы: еўрапейская інтэграцыя, палітычная міфалогія, кансерватызм, нацыяналізм, гістарычная палітыка, архетыпы

Інстытуты палітыкі

***Вадзім Смок.* Рэгіянальная палітычная эліта Беларусі і Польшчы: параўнальны аналіз Гарадзенскай вобласці і Падляшскага ваяводства**

У артыкуле даследуецца ўплыў палітычных і эканамічных інстытутаў Беларусі і Польшчы на працэс фармавання элітаў у Гарадзенскай вобласці і Падляшскім ваяводстве. Паводле гіпотэзы, розная інстытуцыйная спадчына, сучасны палітычны рэжым ды структура эканомікі павінны мець вынікам розную структуру рэгіянальных элітаў. На аснове звестак пра дэпутатаў праводзіцца аналіз складу рэгіянальных прадстаўнічых органаў улады паводле шэрагу крытэраў. Вынікі параўнання часткова пацвярджаюць пастаўлены тэзіс праз відавочныя адрозненні ў складах прадстаўнічых органаў. Разам з тым, заўважаецца пэўнае падабенства двух выпадкаў, а таксама ўплыў іншых чыннікаў на фармаванне рэгіянальных палітычных элітаў, што дазваляе гаварыць пра комплекснасць і неадназначнасць гэтага працэсу.

Ключавыя словы: Гарадзенская вобласць, Падляшскае ваяводства, рэгіянальныя эліты, дэмакратыя, аўтарытарызм

Рэцэнзіі (гісторыя)

***Аляксандр Шамякін.* Ад Брэста да БССР.** *Траццяк, С. А. (2009). Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі: лістапад 1917 – студзень 1919 г.*

У рэцэнзіі разглядаецца кніга беларускага гісторыка С. Трацяка, прысвечаная палітычным і дзяржаватворчым працэсам у Беларусі ў 1917–1919 гадах.

Ключавыя словы: рэцэнзія, БНР, БССР, беларуская дзяржава, рэвалюцыя, Першая сусветная вайна

Аляксандр Філіпаў. **Беларусь: нетрадыцыйная гісторыя.** *Беларусь в ХХ веке: нетрадиционное представление истории (2010). Под ред. В. Н. Сидорцова.*

Рэцэнзія прысвечаная спрэчнай інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі ў кнізе пад рэдакцыяй беларускага гісторыка В. Сідарцова. Крытычна аналізуюцца асобныя канцэпцыі, метады і эмпірычны матэрыял прапанаваны ў кнізе.

Ключавыя словы: рэцэнзія, гісторыя Беларусі, гістарычная навука, сінергетыка, гісторыя паўсядзённасці

Уладзіслаў Іваноў. **«Разам, але амаль асобна».** *Монолатій, Іван (2010). Разом, але майже окремо. Взаємодія етнополітичних акторів на західноукраїнських землях у 1867–1914 рр.*

Разглядаецца кніга ўкраінскага даследчыка Івана Маналація, фокусам якой выступае этнічнае і палітычнае развіццё Заходняй Украіны ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя.

Ключавыя словы: рэцэнзія, Заходняя Украіна, этнічная палітыка, этнічныя стасункі, Аўстра-Венгрыя

Уладзімір Шчэрбаў. **Усходняя Еўропа – адзіная вялікаю крывёю.** *Snyder, Timothy (2010). Bloodlands. Europe between Hitler and Stalin.*

Рэцэнзія на вядомую і дастаткова папулярную кнігу амерыканскага гісторыка Т. Снайдэра. Аналізуецца канцэпцыя і метады гістарычнага наратыву, таксама звяртаецца ўвага на пэўныя праблемы ў даследаванні, звязаныя з выкарыстаннем аўтарам кнігі пераважна другасных гістарычных крыніц.

Ключавыя словы: рэцэнзія, Другая сусветная вайна, палітычныя рэпрэсіі, масавыя забойствы, ахвяры вайны

Аляксей Ластоўскі. **Бунт тутэйшых супраць нацыі.** *Чернявская, Юлия (2010). Белорусы. От тутэйшых – к нации.*

Рэцэнзія разглядае кнігу беларускай даследчыцы Юліі Чарняўскай, прысвечаную асаблівасцям фарміравання беларускай нацыі і нацыянальнай ідэнтычнасці.

Ключавыя словы: рэцэнзія, Беларуская нацыя, ідэнтычнасць, этнічная гісторыя, фальклор, нацыянальная самасвядомасць

Рэцэнзіі (палітыка, грамадства)

Павел Баркоўскі. **Дыялогі для пераацэнкі каштоўнасцяў.** *Мацкевич, В.В. (2010). Переоценка ценностей в культуре и истории Беларуси.*

У рэцэнзіі разглядаецца кніга вядомага беларускага інтэлектуала і грамадскага дзеяча Уладзіміра Мацкевіча. Аналізуецца логіка аўтара ў вырашэнне «праблемы каштоўнасцяў» у сучасным беларускім грамадстве і культуры.

Ключавыя словы: рэцэнзія, Уладзімір Мацкевіч, культурныя каштоўнасці, беларуская палітыка, інтэрпрэтацыя гісторыі, метадалогія

Андрэй Асадчы. **У ідэалагічным працэсе: неўтаймаваная плынь фактаў ды ідэяў.** *Слука, О. Г. (2010). Идеологические процессы в Беларуси.*

У рэцэнзіі крытычна аналізуецца кніга Алега Слукі – аднаго з актыўных прапагандыстаў «ідэалогіі беларускай дзяржавы», – прысвечаная ідэалагічным працэсам у сучаснай Беларусі.

Ключавыя словы: рэцэнзія, ідэалогія беларускай дзяржавы, нацыянальная ідэя, беларуская палітыка, беларуская дзяржава

Таццяна Чыжова. **Беларускі штогоднік: аналітыка, навука і публіцыстыка.** *Белорусский ежегодник. Сборник обзорных и аналитических материалов по развитию ситуации в Республике Беларусь (2010). Сост. и ред. А. Паньковский, В. Костюгова.*

У тэксце рэцэнзуецца найбольш вядомае штогадовае выданне, прысвечанае сацыяльнаму, палітычнаму і эканамічнаму развіццю Беларусі ў 2010 годзе.

Ключавыя словы: рэцэнзія, беларуская палітыка, эканоміка, грамадства, аналітыка, палітычная навука

Андрэй Казакевіч. **Беларускі слоўнік плагіяту.** *Шынкароў, В. В., Раманава, С. П. (2011). Беларускі палітычны слоўнік. Мінск: Адукацыя і выхаванне.*

У рэцэнзіі аналізуецца спецыялізаваны слоўнік палітычных тэрмінаў, падрыхтаваны супрацоўнікамі беларускіх дзяржаўных ВНУ.

Ключавыя словы: паліталогія, палітыка, слоўнік, тэрміналогія, плагіят

Сяргей Богдан. **Арыгінальнае даследаванне па неарыгінальнай праблеме.** *Manufacturing Enemy Images? Russian Media Portrayal of Latvia (2008). Ed. Nils Muižnieks.*

У рэцэнзіі разглядаецца кніга сучасных латвійскіх даследчыкаў. Асноўны фокус кнігі – прычыны, кантэкст і стратэгіі фарміравання варожага вобразу Латвіі ў расійскіх СМІ.

Ключавыя словы: рэцэнзія, Латвія, Расія, вобраз ворага, інфармацыйныя войны, СМІ

Сяргей Богдан. **Канчатковы Афганістан беларускай навукі.** *Сturейко, Степан, Медяник, Владимир (2009). Афганистан: этнополитический конфликт и проблема перемещенных лиц.*

У рэцэнзіі крытычна аналізуецца кніга беларускіх гісторыкаў, прысвечаная праблеме ўзброенага канфлікту ў Афганістане.

Ключавыя словы: рэцэнзія, Афганістан, узброены канфлікт, уцякацтва (бежанства), беларуская навука, даследаванне Усходу

© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819–3625 №16-17(1-2), 2011

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Политика языка №16-17(1-2)/2011

Аннотации и ключевые слова

Ирина Лашук, Оксана Шелест. Символическое и коммуникативное измерения языковых практик беларусских поляков

В статье рассматривается роль польского языка как одной из основ конструирования этнической идентичности беларусских поляков, факторы выбора родного языка как специфического символического акта, и влияние этого выбора на другие аспекты содержания групповой идентичности. Особое внимание уделяется анализу использования польского, беларусского и русского языков в реальных коммуникативных практиках беларусских поляков, установок на сохранение и трансляцию польского языка как одного из механизмов сохранения идентичности и культорного своеобразия этого сообщества.

Ключевые слова: беларусские поляки, этническая идентичность, язык, языковые практики, диглоссия

Алексей Ластовский. Образы власти, народа и «чужих» в публичных выступлениях высших должностных лиц Беларуси в период «либерализации» (2008–2010 годы)

В данной статье анализируются процессы формирования и трансляции образов власти, народа и «чужих» в выступлениях беларусских должностных лиц в период либерализации (2008–2010 гг.). Проверяется гипотеза, в соответствии с которой либерализация должна проявляться и в публичных текстах, где она должна вести к отрицанию стратегии изоляции и снижению агрессивности по отношению к тем, кто традиционно воспринимается как «чужие». Делается вывод, что либерализация понималась беларусской властью в очень ограниченном формате, что в конце концов привело к закономерному сворачиванию этого курса.

Ключевые слова: политическая идентичность, публичные вытупления, беларусские должностные лица, либерализация

Владислав Иванов. Феминизация nomina agentis беларусского языка и проблема колонизации

Статья посвящена узкой и довольно маргинальной языковой теме – феминизации nomina agentis беларусского языка. Если на первый взгляд тема воспринимается слишком узко, то ее понимание и артикуляция через призму современных дебатов вокруг беларусского правописания, а также через феминистскую призму ведет к ко-

лониалистской перспективе. На примере принятия и отрицания феминизации отчетливо видно, насколько официальный язык является колониальным продуктом, который ссылается на стилистические нормы русского языка.

Ключевые слова: колониализм, языковой колониализм, деколонизация, феминизация языка, феминизация nomina agentis, языковая политика

Андрей Казакевич, Андрей Осадчий. **Начать писать по-беларусски. Региональный и социальный состав беларсского возрождения, конец XIX – начало XX века**

Статья предлагает результаты анализа биографий представителей беларусского культурного движения, которые начали публицистическую либо литературную деятельность на беларусском языке между 1880 и 1918 годами. В частности, рассматривается география рождения, возраст присоединения к культурному движению, социальное происхождение, уровень образования, профессия, продолжительность жизни, причина смерти и некоторые другие параметры. Проведенный анализ позволяет увидеть некоторые важные региональные и социальные особенности представителей беларусского движения как группы, и более детально понимать нациетворческий процесс на рубеже XIX и XX веков.

Ключевые слова: беларусская нация, возрождение, культурное движение, нациетворчество, социальная история

Олег Дернович. **Литовский язык в Великом Княжестве Литовском: между функцией и статусом**

Главная проблема, которая ставится в статье, – почему литовский язык, имея с начала XVI века свои первые письменные фиксации, а с 1547 г. и богатую традицию книгопечатания (правда, преимущественно в герцогской Пруссии), так и не смог получить статус официального канцелярского языка в государстве, которое называлось Великое Княжество Литовское? Автор статьи видит возможный ответ в признании того, что в полиэтническом и поликультурном обществе ВКЛ XV–XVII вв. существовала языковая ситуация «множества диглоссий», когда за каждым языком были закреплены определенные общественные функции. В отличие от билингвизма, диглоссия как социолингвистический феномен предусматривает для тех, кто говорит, оценку своих идиом по шкале «праздничное–будничное». В одной и той же общественной сфере одновременно не использовались две языковые системы (официальная и народная).

Ключевые слова: социолингвистическая ситуация, катехизация, книгопечатание, официальный канцелярский язык, диглоссия

Ирина Михеева. **Политическая и социокультурная основа идеологемы «Четвертая Речь Посполитая»**

Статья раскрывает специфику сложного комплекса культурно-исторических, политико-экономических и ментальных причин становления идеологемы «Четвертая

Речь Посполитая» в ее правой версии (в рамках социал-консервативной идеологии партии «Право и Справедливость»). Анализируется ряд архетипических основ польского феномена «исторической политики» (миф врага, миф нового государства и нового человека, миф жертвы), а также проявления «языческого прошлого» в политической современности польского государства (культ святых гор, мартирологический культ). Делается вывод о целесообразности рассмотрения культурно-политической истории Польши в категориях постколониализма, который позволяет определить в национально-консервативном политическом дискурсе специфическую идеологию аннигиляции наследия ПНР, повстанческую мифологию и культ поражения.

Ключевые слова: европейская интеграция, политическая мифология, консерватизм, национализм, историческая политика, архетипы

Вадим Смок. **Региональная политическая элита Беларуси и Польши: сравнительный анализ Гродненской области и Подляшского воеводства**

В статье исследуется влияние политических и экономических институтов Беларуси и Польши на процесс формирования элиты в Гродненской области и Подляшском воеводстве. В соответствии с гипотезой, различное институциональное наследие, современный политический режим и структура экономики должны приводить к различиям в структуре региональных элит. На основе сведений о депутатах проводится анализ состава региональных представительных органов власти по ряду критериев. Результаты сравнения частично подтверждают выдвинутый тезис, о чем свидетельствуют явные различия в составах представительных органов. Вместе с тем, наблюдается некторое подобие двух случаев, а также влияние друих факторов на формирование региональных политических элит, что дает основание говорить о комплексности и неоднозначности этого процесса.

Ключевые слова: Гродненская область, Подляшское воеводство, региональные элиты, демократия, авторитаризм

Александр Шамякин. **От Бреста к СССР.** *Трацця́к, С. А. (2009). Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі: лістапад 1917 – студзень 1919 г.*

В рецензии рассматривается книга беларусского историка С. Третьяка, посвященная политическим процессам и процессам строительства государства в Беларуси в 1917–1919 годах.

Ключевые слова: рецензия, БНР, БССР, беларусское государство, революция, первая мировая война

Александр Филиппов. **Беларусь: нетрадиционная история.** *Беларусь в XX веке: нетрадиционное представление истории (2010). Под ред. В. Н. Сидорцова.*

Рецензия посвящена спорной интерпретации истории Беларуси в книге под редакцией беларусского историка В. Сидорцова. Критически анализируются отдельные концепции, методы и эмпирический материал, предложенный в книге.

Ключевые слова: рецензия, история Беларуси, историческая наука, синергетика, история повседневности

***Владислав Иванов.* «Вместе, но почти отдельно»** *Монолатій, Іван (2010). Разом, але майже окремо. Взаємодія етнополітичних акторів на західноукраїнських землях у 1867–1914 рр.*

Рассматривается книга украинского исследователя Ивана Маналатия, в фокусе которой находится этническое и политическое развитие Западной Украины во второй половине XIX – начале XX века.

Ключевые слова: рецензия, Западная Украина, этническая политика, этнические отношения, Австро-Венгрия

***Владимир Щербов.* Восточная Европа – едина большой кровью.** *Snyder, Timothy (2010). Bloodlands. Europe between Hitler and Stalin.*

Рецензия на известную и довольно популярную книгу американского историка Т. Снайдера, в которой нализируется концепция и методы исторического нарратива. Также обращается внимание на определенные проблемы в исследовании, связанные с использованием автором книги преимущественно вторичных исторических источников.

Ключевые слова: рецензия, Вторая мировая война, политические репрессии, массовые убийства, жертвы войны

***Алексей Ластовский.* Бунт тутэйших против нации.** *Чернявская, Юлия (2010). Белорусы. От тутэйшых – к нации.*

Рецензия рассматривает книгу беларуской исследовательницы Юлии Чернявской, посвященную особенностям формирования беларусской нации и национальной идентичности.

Ключевые слова: рецензия, беларусская нация, идентичность, этническая история, фольклор, национальное самосознание

***Павел Барковский.* Диалоги для переоценки ценностей.** *Мацкевич, В.В. (2010). Переоценка ценностей в культуре и истории Беларуси.*

В рецензии рассматривается книга известного беларусского интеллектуала и общественного деятеля Владимира Мацкевича. Анализируется логика автора в решении «проблемы ценностей» в современном беларусском обществе и культуре.

Ключевые слова: рецензия, Мацкевич, культурные ценности, беларусская политика, интерпретация истории, методология

***Андрей Асадчий.* В идеологическом процессе: необузданное течение фактов и идей.** *Слука, О. Г. (2010). Идеологические процессы в Беларуси.*

В рецензии критически анализируется книга Олега Слуки – одного из активных пропогандистов «идеологии беларусского государства», посвященная идеологическим процессам в современной Беларуси.

Ключевые слова: рецензия, идеология беларусского государства, национальная идея, беларуская политика, беларуское государство

Татьяна Чижова. **Беларусский ежегодник: аналитика, наука и публицистика.** *Белорусский ежегодник. Сборник обзорных и аналитических материалов по развитию ситуации в Республике Беларусь (2010). Сост. и ред. А. Паньковский, В. Костюгова.*

В тексте рецензируется наиболее известное ежегодное издание, посвященное социальному, политическому и экономическому развитию Беларуси в 2010 году.

Ключевые слова: рецензия, беларусская политика, экономика, общество, аналитика, политическая наука

Андрей Казакевич. **Беларусский словарь плагиата: copy + past.** *Шынкароў, В. В., Раманава, С. П. (2011). Беларускі палітычны слоўнік. Мінск: Адукацыя і выхаванне.*

В рецензии анализируется специализированный словарь политических терминов, подготовленный сотрудниками беларусских государственных вузов.

Ключевые слова: политология, политика, словарь, терминология, плагиат

Сергей Богдан. **Оригинальное исследование по неоригинальной проблеме.** *Manufacturing Enemy Images? Russian Media Portrayal of Latvia (2008). Ed. Nils Muižnieks.*

В рецензии рассматривается книга современных латвийских исследователей. Основной фокус книги – причины, контекст, и стратегии формирования враждебного образа Латвии в российских СМИ.

Ключевые слова: рецензия, Латвия, Россия, образ врага, информационые войны, СМИ

Сергей Богдан. **Окончательный Афганистан беларуской науки.** *Стурейко, Степан, Медяник, Владимир (2009). Афганистан: этнополитический конфликт и проблема перемещенных лиц.*

В рецензии критически анализируется книга беларусских историков, посвященная проблеме вооруженного конфликта в Афганистане.

Ключевые слова: рецензия, Афганистан, вооруженный конфликт, беженство, беларусская наука, исследование Востока